Радыё Свабода

ЭЎРАЗЬВЯЗ

Хто ў чацьвёртым пакеце санкцыяў Эўразьвязу. Поўны сьпіс

21 чэрвень 2021, 12:58

Радыё Свабода

На пасяджэньні ў Люксэмбургу 21 чэрвеня міністры замежных спраў Эўразьвязу зацьвердзілі чацьвёрты пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2020 году ў Беларусі пакет санкцый супраць беларускага рэжыму.

Санкцыйны сьпіс з 78 чалавек і 8 арганізацый, якім замарожваюцца актывы і забараняецца выдача візаў у Эўразьвяз, апублікаваны ў афіцыйным часопісе Эўразьвязу, такім чынам ён набывае моц.

Свабода публікуе ўвесь санкцыйны сьпіс Эўразьвязу і матывацыю афіцыйных прадстаўнікоў ЭЗ:

Судзьдзі, сьледчыя і пракуроры

- **Натальля Бугук**, судзьдзя Фрунзэнскага раёну Менску. Вынесла прысуд журналісткам «Белсату» Кацярыне Андрэевай і Дар'і Чульцовай.
- **Аліна Касьянчык**, памочніца пракурора ў судзе Фрунзэнскага раёну, удзельніца палітычна матываваных справаў супраць удзельнікаў мірных пратэстаў.
- **Ігар Курыловіч**, старшы сьледчы Сьледчага камітэту ў Фрунзэнскім раёне Менску. Адказны за завядзеньне палітычных крымінальных справаў.
- **Сяргей Шаціла**, судзьдзя Савецкага раёну Менску. Адказвае за шматлікія палітычна матываваныя пастановы супраць пратэстоўцаў, у прыватнасьці Натальлі Хершэ, Дзьмітрыя Галко і Дзьмітрыя Караткевіча.
- **Анастасія Ачалава**, судзьдзя Ленінскага раёну Менску. Палітычна матываваныя прысуды супраць журналістаў, пратэстоўцаў, пэнсіянэраў, у прыватнасьці чальца

Каардынацыйнай рады Дзьмітрыя Крука.

- **Марыя Ярохіна**, судзьдзя Фрунзэнскага раёну Менску. Выносіла палітычныя прысуды спартоўцам, прафсаюзным дзеячам, журналістам, у прыватнасьці фатографу Ўладзю Грыдзіну.
- **Юлія Блізьнюк**, судзьдзя Фрунзэнскага раёну Менску. Выносіла прысуды журналістам, актывістам і пратэстоўцам, у прыватнасьці Арцёму Хвашчэўскаму, Арцёму Саўчуку, Максіму Паўлюшчыку.
- **Анастасія Кулік,** судзьдзя Першамайскага раёну Менску. Шматлікія палітычныя прысуды, у прыватнасьці адказная за зьняволеньне Аляксандра Захарэвіча.
- **Максім Трусевіч**, судзьдзя Першамайскага раёну Менску. Палітычныя прысуды актывістам, лідэрам апазыцыі і журналістам.
- **Тацяна Матыль**, судзьдзя Маскоўскага раёну Менску. Адказная, у прыватнасьці, за прысуды Міколу Статкевічу і журналісту Аляксандру Баразенку.
- **Аляксандар Рудзенка,** намесьнік старшыні Кастрычніцкага суду Менску. Адказвае за палітычна матываваныя пастановы супраць журналістаў, актывістаў, у прыватнасьці штрафы пэнсіянэрам і інвалідам, прысуд Людміле Казак — адвакатцы Марыі Калесьнікавай.
- **Аляксандар Воўк**, судзьдзя Савецкага раёну Менску. Прысуды мірным дэманстрантам, у прыватнасьці сёстрам Анастасіі і Вікторыі Міронцавым.
- **Вольга Няборская**, судзьдзя Кастрычніцкага раёну Менску. Вынесла прысуды Соф'і Малашэвіч і Ціхану Клюкачу.
- **Марына Запасьнік**, намесьніца старшыні Ленінскага суду Менску. Палітычныя прысуды Ўладзіславу Зяневічу, Вользе Паўлавай, Вользе Класкоўскай, Віктару Барушку, Сяргею Раткевічу, Аляксею Чарвінскаму, Андрэю Хранкову, студэнту Віктару Актыставу і непаўналетняму Максіму Бабічу.
- **Максім Філатаў**, судзьдзя ў Лідзе, Горадзенская вобласьць. Шэраг палітычных судоў, у прыватнасьці прысуд Вітольду Ашурку.
- **Андрэй Грушко**, судзьдзя Ленінскага раёну Берасьця. Вынес шэраг палітычна матываваных прысудаў.
- **Дзьмітрый Гара**, старшыня Сьледчага камітэту. Нясе адказнасьць за палітычна матываваныя крымінальныя справы супраць мірных пратэстоўцаў, журналістаў, іншых грамадзян. Удзельнічаў у справе Сяргея Ціханоўскага.
- **Аляксей Стук**, намесьнік генэральнага пракурора. Нясе адказнасьць за палітычныя рэпрэсіі.

- **Генадзь Дыско**, намесьнік генэральнага пракурора. Удзельнічаў у ініцыяваньні справы супраць Сяргея Ціханоўскага.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Кіраўнік Эўрапейскай рады назваў мэту новых санкцыяў супраць уладаў Беларусі

Дэпутаты

- **Сьвятлана Любецкая**, дэпутатка Палаты прадстаўнікоў. На пасадзе старшыні парлямэнцкай камісіі па заканадаўстве адказвае за прыняцьце новага кодэксу РБ аб адміністрацыйных правапарушэньнях, які дазваляе адвольныя арышты і павышае адказнасьць за ўдзел у масавых мерапрыемствах.
- **Аляксей Ягораў**, чалец Палаты прадстаўнікоў, сябра камісіі заканадаўства. Адказны за прыняцьце новага Адміністрацыйнага кодэксу.
- **Аляксандар Амельянюк**, чалец Палаты прадстаўнікоў. Сябра камісіі заканадаўства. Адказны за прыняцьце новага Адміністрацыйнага кодэксу.
- **Алег Гайдукевіч**, намесьнік старшыні Пастаяннай камісіі па Міжнародных справах у Палаце прадстаўнікоў. Публічна падтрымаў прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Санкцыі, на якія напрасіліся. Дыскусія экспэртаў пра рашэньне Эўразьвязу

Дзяржаўныя СМІ і прапаганда

- **Андрэй Мукавозчык**, палітычны аглядальнік «Беларусь сегодня». Зьяўляецца адным з галоўных дзяржаўных прапагандыстаў, які апраўдвае рэпрэсіі і публікуе фэйкі.

- **Сяргей Гусачэнка**, намесьнік старшыні Белтэлерадыёкампаніі. Адказвае за падачу хлусьлівай інфармацыі аб выніках прэзыдэнцкіх выбараў, пратэстах і рэпрэсіях.
- **Генадзь Давыдзька**, чалец Палаты Прадстаўнікі, старшыня Камітэту па правах чалавека і СМІ. Адзін з асноўных прапагандыстаў рэжыму. Часта карыстаўся мовай варожасьці і заахвочваў да гвалту супраць мірных дэманстрантаў.
- **Вольга Чамаданава**, прэс-сакратарка МУС. Адыгрывае ключавую ролю ў скажэньні і адмаўленьні фактаў гвалту супраць пратэстоўцаў, а таксама ў распаўсюдзе ілжывай інфармацыі пра іх. Яна пагражала мірным дэманстрантам і працягвае апраўдваць гвалт у дачыненьні да іх.

Адміністрацыя ВНУ

- **Сяргей Скрыба**, намесьнік рэктара Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту. Адказвае за рэпрэсіі супраць студэнтаў і іх адлічэньні з ВНУ.
- **Сяргей Рубнікові**ч, рэктар Беларускага дзяржаўнага мэдычнага ўнівэрсытэту. Адказны за адлічэньне студэнтаў па палітычных матывах.
- **Аляксандар Бахановіч**, рэктар Берасьцейскага дзяржаўнага тэхнічнага ўнівэрсытэту. Адказны за адлічэньне студэнтаў па палітычных матывах.
- **Міхаіл Баразна**, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Адказны за адлічэньне студэнтаў па палітычных матывах.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Алексін, Гуцэрыеў, Зайцаў, Цяцерын. Што за набліжаныя да Лукашэнкі бізнэсоўцы падпалі пад санкцыі

Чыноўнікі, функцыянэры, бізнэсоўцы

- **Максім Рыжанкоў**, першы намесьнік старшыні Адміністрацыі прэзыдэнта. Адказны за рэалізацыі паўнамоцтваў Лукашэнкі ва ўнутранай і зьнешняй палітыцы.
- **Дзьмітрый Лукашэнка**, бізнэсовец, старшыня Прэзыдэнцкага спартыўнага клюбу. Праз гэтую арганізацыю ён вядзе бізнэс і кантралюе шэраг кампаній.

- **Лілія Лукашэнка,** бізнэсовец, дырэктарка мастацкай галерэі. Шчыльна зьвязаная з шэрагам гучных кампаній, якія выйгралі ад рэжыму Лукашэнкі, уключаючы Dana Holdings / Dana Astra, канцэрн «Белмастацпромыслы» і «Eastleigh trading Ltd».
- **Валерый Іванковіч**, гнэральны дырэктар «МАЗ». Нясе адказнасьць за арышты рабочых на тэрыторыі заводу і палітычныя звальненьні.
- **Аляксандар Шатроў**, бізнэсовец, уладальнік і дырэктар кампаніі Synesis. Гэтая кампанія перадала беларускім уладам плятформу назіраньня Kipod, якая аналізуе відэазапісы і распазнае твары. Дзякуючы гэтай кампаніі многія людзі былі асуджаныя ў палітычных працэсах.
- **Сяргей Цяцерын**, бізнэсовец, уладальнік кампаніі BELGLOBALSTART, саўладальнік VIBEL. Старшыня Беларускай фэдэрацыі тэнісу. Набліжаны да атачэньня Лукашэнкі.
- **Міхаіл Гуцэрыеў**, расейскі бізнэсовец зь бізнэс-інтарэсамі ў Беларусі, уладальнік кампаніяў Сафмар, Слаўкалій і Слаўнафта. Дзякуючы сяброўству з Лукашэнкам займеў значнае багацьце і ўплыў сярод палітычнай эліты ў Беларусі.
- **Аляксей Алексін**, адзін зь вядучых бізнэсоўцаў Беларусі, саўладальнік Bremino Group. Мае шырокія інтарэсы ў нафтавай галіне, энэргетыцы, нерухомасьці, лягістыцы, тытунёвай галіне.
- **Аляксандар Зайцаў**, бізнэсовец, саўладальнік Bremino Group і Sohra Group. Былы памочнік Віктара Лукашэнкі. Яго кампаніі прадстаўлена права на экспарт прадукцыі дзяржаўных прадпрыемстваў (трактары, грузавыя аўтамабілі) у Пэрсыдзкую затоку і афрыканскія краіны.
- **Іван Мысьліцкі**, намесьнік начальніка Дэпартамэнта выкананьня пакараньняў МУС. Нясе адказнасьць за бесчалавечныя і прыніжаючыя годнасьць дзеяньні, у тым ліку катаваньні да грамадзян, якія ўдзельнічалі ў мірных акцыях пратэсту і былі затрыманыя.
- **Алег Белякоў**, намесьнік начальніка Дэпартамэнта выкананьня пакараньняў МУС. Нясе адказнасьць за бесчалавечныя і прыніжаючыя годнасьць дзеяньні, у тым ліку катаваньні да грамадзян, якія ўдзельнічалі ў мірных акцыях пратэсту і былі затрыманыя.
- **Уладзіслаў Мандрык**, намесьнік начальніка Дэпартамэнта выкананьня пакараньняў МУС. Нясе адказнасьць за бесчалавечныя і прыніжаючыя годнасьць дзеяньні, у тым ліку катаваньні да грамадзян, якія ўдзельнічалі ў мірных акцыях пратэсту і былі затрыманыя.

- **Алег Лашчыноўскі**, былы намесьнік начальніка Дэпартамэнта выкананьня пакараньняў МУС. Нясе адказнасьць за бесчалавечныя і прыніжаючыя годнасьць дзеяньні, у тым ліку катаваньні да грамадзян, якія ўдзельнічалі ў мірных акцыях пратэсту і былі затрыманыя.
- **Жанна Батурыцкая**, начальніца ўпраўленьня выкананьня прысудаў Дэпартамэнта выкананьня пакараньняў МУС. Нясе адказнасьць за бесчалавечныя і прыніжаючыя годнасьць дзеяньні, у тым ліку катаваньні да грамадзян, якія ўдзельнічалі ў мірных акцыях пратэсту і былі затрыманыя.
- **Дзьмітрый Страбкоў**, начальнік турмы нумар 8 у Жодзіне. Нясе адказнасьць за жудасныя ўмовы ў турме, за бесчалавечныя і прыніжаючыя годнасьць дзеяньні, у тым ліку катаваньні да грамадзян, якія ўдзельнічалі ў мірных акцыях пратэсту і былі затрыманыя.
- **Яўген Шапецька**, начальнік Цэнтра ізаляцыі правапарушальнікаў (Акрэсьціна). Нясе адказнасьць за жудасныя ўмовы ў цэнтры ізаляцыі і за бесчалавечнае абыходжаньне, уключаючы катаваньні затрыманых пасьля выбараў 2020 году.
- **Ігар Кенюх**, начальнік Ізалятара часовага ўтрыманьня (Акрэсьціна). Нясе адказнасьць за жудасныя ўмовы ў ізалятары і за бесчалавечнае абыходжаньне, уключаючы катаваньні затрыманых пасьля выбараў 2020 году.
- **Глеб Дрыль**, намесьнік начальніка Ізалятара часовага ўтрыманьня (Акрэсьціна). Нясе адказнасьць за жудасныя ўмовы ў ізалятары і за бесчалавечнае абыходжаньне, уключаючы катаваньні затрыманых пасьля выбараў 2020 году.
- **Уладзімер Лапыр,** намесьнік начальніка Ізалятара часовага ўтрыманьня (Акрэсьціна). Нясе адказнасьць за жудасныя ўмовы ў ізалятары і за бесчалавечнае абыходжаньне, уключаючы катаваньні затрыманых пасьля выбараў 2020 году.
- **Аляксандар Васілюк**, кіраўнік сьледчай групы Сьледчага камітэту. Нясе адказнасьць за палітычна матываваныя справы і затрыманьні, у прыватнасьці чальцоў Каардынацыйнай рады, у тым ліку Марыі Калесьнікавай. Адказны за затрыманьні журналістаў.
- **Яўген Архірэеў**, кіраўнік Галоўнага сьледчага аддзелу Цэнтральнага офіса Сьледчага камітэту. Адказвае за ініцыяваньне і расьсьледаваньне палітычна матываваных крымінальных справаў, у прыватнасьці Каардынацыйнай рады і іншых удзельнікаў акцыяў пратэсту.
- **Аляксей Каўрыжкін**, кіраўнік сьледчай групы, Галоўны сьледчы аддзел, Сьледчы камітэт. Нясе адказнасьць за палітычна матываваны перасьлед і ўтрыманьне пад вартай, у прыватнасьці чальцоў

каманда Віктара Бабарыкі і сябраў Каардынацыйнай рады, у тым ліку юрыста Максіма Знака.

- **Аляксандар Агафонаў,** першы намесьнік кіраўніка Галоўнага сьледчага аддзелу, Сьледчы камітэт. Адказны за перасьлед па палітычных матывах і арышты Сяргея Ціханоўскага, Мікалая Статкевіча і Дзьмітрыя Казлова.
- **Канстанцін Бычак**, начальнік сьледчага аддзелу КДБ. Курыраваў палітычна матываванае расьсьледаваньне справы Віктар Бабарыкі.
- **Андрэй Бакач**, начальнік РУУС Першамайскага раёну Менску. Адказны за дзеяньні міліцыі падчас затрыманьняў і ў пастарунку, калі пратэстоўцы падвяргаліся жорсткім і бесчалавечным дзеяньням.
- **Аляксандар Палулех**, начальнік РУУС Фрунзэнскага раёну Менску. Адказны за дзеяньні міліцыі падчас затрыманьняў і ў пастарунку, калі пратэстоўцы падвяргаліся жорсткім і бесчалавечным дзеяньням.
- **Аляксандар Захвіцэвіч**, намесьнік начальніка РУУС Фрунзэнскага раёну Менску. Адказны за дзеяньні міліцыі падчас затрыманьняў і ў пастарунку, калі пратэстоўцы падвяргаліся жорсткім і бесчалавечным дзеяньням. Сілавікі пад наглядам Захвіцэвіча катавалі затрыманых.
- **Сяргей Ушакоў**, намесьнік начальніка РУУС Фрунзэнскага раёну Менску. Адказны за дзеяньні міліцыі падчас затрыманьняў і ў пастарунку, калі пратэстоўцы падвяргаліся жорсткім і бесчалавечным дзеяньням. Сілавікі пад наглядам Ушакова катавалі затрыманых.
- **Сяргей Арцёменка**, намесьнік начальнікв РУУС Першамайскага раёну Менску. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні. Ён адказвае за катаваньні над Максімам Харошыным, уладальнікам кветкавай крамы, які дарыў кветкі падчас Жаночага маршу.
- **Аляксандар Рыдзецкі**, былы начальнік РУУС Кастрычніцкага раёна Менску, кіраўнік упраўленьня ўнутранай бясьпекі Дзяржаўнай судовай экспэртызы. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні.
- **Дзьмітрый Бурдзюк**, начальнік РУУС Кастрычніцкага раёну Менску, былы начальнік Партызанскага РУУС. Адказны за нагляд за жорсткімі пабоямі і катаваньнямі мірных дэманстрантаў і выпадковых мінакоў пасьля выбараў 2020 году.

- **Віталь Капілевіч**, начальнік Ленінскага РУУС Менску. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні. Затрыманым было адмоўлена ў мэдычнай дапамозе.
- **Кірыл Кіслоў**, начальнік РУУС Завадзкога раёну Менску. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні. Адказвае за масавыя рэпрэсіі супраць мірных дэманстрантаў, журналістаў, праваабаронцаў, рабочых, прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасьці і выпадковых мінакоў.
- **Сяргей Варэйка**, начальнік РУУС Маскоўскага раёну Менску, былы намесьнік начальніка Заводзкага РУУС. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні.
- **Сяргей Дубавік**, намесьнік начальніка Ленінскага РУУС Менску. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні. Затрыманым было адмоўлена ў мэдычнай дапамозе.
- **Аляксандар Андрыеўскі**, намесьнік начальніка Фрунзэнскага РУУС Менску. Адказны за бесчалавечнае і прыніжальнае годнасьць абыходжаньне з затрыманымі, уключаючы катаваньні.
- **Віталь Макрыцкі**, намесьнік начальніка Кастрычніцкага РУУС Менску (да 17 сьнежня 2020). Начальнік Партызанскага РУУС. Адказны за нагляд за жорсткім зьбіцьцём і катаваньнямі мірных дэманстрантаў і мінакоў.
- **Яўген Урублеўскі**, старэйшы сяржант міліцыі і Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў (Акрэсьціна). Нясе адказнасьць за бесчалавечнае і зьневажальнае абыходжаньне, катаваньні затрыманых у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў.
- **Мікалай Карпянкоў**, намесьнік міністра ўнутраных справаў, былы начальнік ГУБАЗіК. Адказны за бесчалавечнае і зьневажальнае годнасьць абыходжаньне з удзельнікамі мірных пратэстаў і за іх адвольны арышт і затрыманьне. Шматлікія сьведчаньні, фота і відэа паказваюць, што група пад яго камандаваньнем біла і арыштоўвала мірных дэманстрантаў, пагражаючы ім агнястрэльнай зброяй.
- **Міхаіл Грыб**, начальнік ГУУС Менгарвыканкаму. Адказвае за дзеяньні міліцыі ў Віцебскай вобласьці да кастрычніка 2020 года (дзе ўзначальваў мясцовае ГУУС) і ў Менску з кастрычніка 2020 году, у тым ліку гвалтоўныя рэпрэсіі супраць мірных дэманстрантаў і парушэньні права на мірныя сходы і свабоду слова.
- **Віктар Хрэнін**, міністар абароны. Адказвае за прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега. Публічна заяўляў

пра гатоўнасьць выкарыстоўваць войска супраць мірных дэманстрантаў.

- **Ігар Голуб**, камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны. Адказвае за прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега.
- **Андрэй Гурцэвіч**, начальнік Галоўнага штаба, першы намесьнік камандуючага ВПС. Адказвае за прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега.
- **Леанід Чуро**, гендырэктар «Белаэранавігацыі». Адказвае за прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега.
- **Аляксей Аўраменка**, міністар транспарту. Адказвае за прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега.
- **Арцём Сікорскі**, дырэктар аддзелу авіяцыі Міністэрства транспарту. Адказвае за прымусовую пасадку рэйсу Ryanair, у выніку чаго былі арыштаваныя Раман Пратасевіч і Сафія Сапега.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
«Сохра», «Брэміна Груп», «БелАЗ», «МАЗ». Што за кампаніі падпалі пад санкцыі Эўразьвязу

Раней, у кастрычніку, лістападзе і сьнежні Эўразьвяз увёў тры пакеты санкцый супраць уладаў Беларусі. Абмежавальныя захады тычацца афіцыйных асобаў, а таксама некаторых прадпрыемстваў. Агулам у санкцыйным сьпісе тады апынуліся 84 асобы, якім забаронены ўезд у краіны ЭЗ. У сьпіс уваходзіць Аляксандар Лукашэнка, ягоны сын Віктар Лукашэнка, кіраўніца ЦВК Лідзія Ярмошына, старшыня КДБ Іван Тэртэль, старшыня Сьледчага камітэту Іван Наскевіч, генпракурор Андрэй Швэд і іншыя сілавікі, а таксама судзьдзі і чальцы выбарчых камісіяў.

Сярод іншага, ЭЗ увёў санкцыі супраць юрыдычных асобаў: ЗАТ «Белтэхэкспарт», «Дана Холдынгз/Дана Астра», Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта Беларусі, ТАА «Сінэзіс», ААТ «АГАТ — электрамэханічны завод», ААТ «140-ы рамонтны завод» і ААТ «Менскі завод колавых цягачоў».